Гродзенскі абласны
выканаўчы камітэт
**ГАЛОЎНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ**

Гродненский областной
исполнительный комитет
**ГЛАВНОЕ УПРАВЛЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ**

# ЗАГАД

# ПРИКАЗ

26.12.2018 № 330

г. Гродна

г. Гродно

Аб выніках абласнога конкурса
буктрэйлераў

У снежні 2018 года прайшоў абласны конкурс буктрэйлераў “Мой родны кут, як ты мне мілы…” (далей – конкурс), прысвечаны Году малой радзімы. Арганізатарамі конкурсу з’яўляюцца галоўнае ўпраўленне адукацыі Гродзенскага аблвыканкама, дзяржаўная ўстанова адукацыі “Гродзенскі абласны інстытут развіцця адукацыі”.

На конкурс былі прадстаўлены 103 буктрэйлера з 17 раёнаў Гродзенскай вобласці, а таксама з 23 устаноў прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі:

I намінацыя (вучні V-VIII класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі) – 30 работ;

II намінацыя (вучні IX-XI класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі) – 49 работ;

III намінацыя (навучэнцы ўстаноў прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі) – 24 работы.

Буктрэйлеры, прадстаўленыя на конкурс, выкананы ў розных жанрах: мультфільм, анімацыя, слайд-шоу, відэафільм, відэапастаноўка, рэкламны ролік. Аўтары звярталіся як да творчасці класікаў беларускай літаратуры, жыццё і творчасць якіх звязана з Гродзеншчынай, А.Міцкевіча, Я.Брыля, У.Караткевіча, В.Быкава, Ф.Багушэвіча, Э.Ажэшка, Д. Бічэль-Загнетавай, У.Ліпскага і інш., так і да творчасці пісьменнікаў-землякоў, якія пішуць на беларускай мове, Ніны Рыбік, Ганны Скаржынскай-Савіцкай, Алены Руцкай, Івана Ламашкевіча, Васіля Супруна, Пятра Шаколы, Міколы Іваноўскага, Рычарда Бялячыца і іншых. Журы конкурсу адзначыла, што найбольш тэхнічна якасна і змястоўна выкананы работы вучнямі Слонімскага, Карэліцкага, Воранаўскага раёнаў, навучэнцамі ўстановы адукацыі “Навагрудскі дзяржаўны сельскагаспадарчы прафесійны ліцэй”.

ГД, з. 2670, т. 500 экз.

Дадзены конкурс спрыяў папулярызацыі чытання твораў, кніг беларускіх класікаў, пісьменнікаў-землякоў сярод дзяцей і моладзі праз выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій.

Разам з тым не прынялі ўдзел у конкурсе вучні ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі Дзятлаўскага і Навагрудскага раёнаў.

Па выніках ацэньвання журы

ЗАГАДВАЮ:

1. Узнагародзіць дыпломамі галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама згодна з дадаткамі 1, 2, 3:

I ступені – 5 удзельнікаў,

II ступені – 11 удзельнікаў,

III ступені – 23 удзельніка.

2. Начальнікам упраўленняў (аддзелаў) адукацыі (адукацыі, спорту і турызму) райгарвыканкамаў, адміністрацый раёнаў г. Гродна, дырэктарам устаноў прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі працягнуць работу па падтрымцы чытацкай культуры і папулярызацыі чытання сярод дзяцей і падлеткаў, выкарыстоўваць матэрыялы, падрыхтаваныя дыпламантамі і ўдзельнікамі конкурсу, для фарміравання і развіцця цікавасці навучэнцаў да вывучэння творчасці беларускіх пісьменнікаў.

3. Рэктару дзяржаўнай установы адукацыі “Гродзенскі абласны інстытут развіцця адукацыі” (Сяргейка С.А.) размясціць работы дыпламантаў I ступені на сайце ўстановы.

Начальнік галоўнага ўпраўлення А.Г. Сонгін

Дадатак 1

## “Мой родны кут, як ты мне мілы”
### (І намінацыя – вучні V-VIII класаў)

| № | Раён | Установа адукацыі | Аўтар(ы) | Клас | Твор | Дыплом |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Воранаўскі | Дзяржаўная ўстанова адукацыі (далей – ДУА) “Жырмунская сярэдняя школа” | Гусарава Ульяна, Юхневіч Паліна | V | Г. Скаржынская -Савіцкая “Казкі-чамучкі” | I |
| 2. | Слонімскі | ДУА “Сярэдняя школа №5 г.Слоніма” | Лісоўскі Дзмітрый, Пачук Аляксей, Станкевіч Максім, Явароўскі Аляксей | VIII | Васіль Супрун “Дзеі над Шчарай” | I |
| 3. | Зэльвенскі | Установа адукацыі (далей – УА) “Дзяржаўная гімназія №1 г.п. Зэльва” | Субаткоўская Вераніка, Чаргейка Паліна | VI | У.Караткевіч “Нямоглы бацька” | II |
| 4. | Ленінскі г. Гродна | ДУА “Гімназія № 2 г.Гродна” | Давыдзенка Ксенія, Дзюрдзь Дар’я, Алесюк Глеб | V | Д.Бічэль-Загнетава “Каложа” | II |
| 5. | Лідскі | ДУА “Мінойтаўская сярэдняя школа” | Стацэвіч Станіслаў | VII | А.Руцкая “Школьныя ўсмешкі” | II |
| 6. | Астравецкі | “Гервяцкая сярэдняя школа” | Алексеявец Лізавета | VIII | Ніна Рыбік “Свае і чужыя” | III |
| 7. | Гродзенскі | ДУА “Сярэдняя школа №3 Скідзеля” | Захараў Аляксей | VII | Міхась Васілёк “Іх восем было…” | III |
| 8. | Кастрычніцкі г. Гродна | ДУА “Сярэдняя школа № 39 г.Гродна” | Лагал Карына, Кубяк Ксенія, Сянкевіч Віталій, Яравая Кацярына | VII | “Гродна ў вершах і песнях” | III |
| 9. | Кастрычніцкі г. Гродна | ДУА “Гімназія №1 імя акадэміка Я.Ф. Карскага г. Гродна” | Шурпа Арцём, Шурпа Арсеній | V, VIII | Уладзімір Шурпа “Айчыне” | III |
| 10. | Свіслацкі | ДУА “Вучэбна-педагагічны комплекс Дабравольскі дзіцячы сад – сярэдняя школа” | Лоскат Дар’я | VIII | Мне душу грэе радзімы куток (буктрэйлер па матывах творчасці Івана Ламашкевіча) | III |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 11. | Смаргонскі | ДУА "Гімназія г. Смаргоні" | Бугайчук Вікторыя | VIII | Смаргоншчына любая мая | III |
| 12. | Шчучынскі | ДУА "Гімназія г.Шчучына" | Барыш Дар'я, Іваноўская Паліна, Дзярбук Таццяна, Дзікевіч Валерыя, Рудая Дар'я, Бужынская Карына | VI | Уладзімір Ліпскі "Вясёлка над Нёманам" | III |

Дадатак 2

## “Мой родны кут, як ты мне мілы…”
### (ІІ намінацыя – вучні IX-XI класаў)

| № | Раён | Установа адукацыі | Аўтар(ы) | Клас | Твор | Дыплом |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Карэліцкі | ДУА “Сярэдняя школа г.п. Мір” | Кандзера Арцём Аляксандравіч, Матыборскі Аляксандр Віктаравіч, Нячай Аліна Мікалаеўна | XI | Вандроўка па сцяжынах вечнасці | I |
| 2. | Слонімскі | ДУА “Слонімскі раённы ліцэй” | Жыткевіч Аляксандр Мікалаевіч, Сідарок Дар’я Аляксееўна | XI | Сяргея Чыгрына “Шчырая Шчара” | I |
| 3. | Бераставіцкі | ДУА “Вялікаэйсмантаўская сярэдняя школа” | Анджэеўская Караліна Ежыеўна, Кулікоўскі Яўгеній Юзэфавіч | X | “І пяром, і сэрцам” (па зборніку вершаў Міколы Іваноўскага) | II |
| 4. | Воранаўскі | ДУА “Пагародзенская сярэдняя школа” | Гень Міраслаў Валянцінавіч | IX | Л.Лаўрэш “Генерал, які дайшоў да Беларусі” | II |
| 5. | Лідскі | ДУА “Сярэдняя школа № 8 г.Ліды” | Галадок Анастасія Юр’еўна Булай Кацярына Аляксандраўна | IX | С.Суднік “Лідскія скрыжалі” | II |
| 6. | Шчучынскі | ДУА “Сярэдняя школа №1 г.Шчучына” | Гудач Максім Віктаравіч, Жык Аляксей Віктаравіч, Зенкевіч Вікторыя Віктараўна | X-XI | “Сіла паэзіі” (па зборніку вершаў Рычарда Бялячыца “Вяртанн пчалы”) | II |
| 7. | Ашмянскі | ДУА “Сярэдняя школа №2 г.Ашмяны” | Шыдлоўскі Максім, Грыгарук Карына, Ясевіч Кацярына | XI | Жыццё і творчасць Пятра Шаколы | III |
| 8. | Астравецкі | ДУА “Рымдзюнская сярэдняя школа з | Войшка Караліна | X | Адам Міцкевіч “Гражына” | III |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | літоўскай мовай навучання” | Валянцінаўна | | | |
| 9. | Ваўкавыскі | ДУА “Сярэдняя школа №5 г.Ваўкавыска” | Скепка Максім Мікалаевіч, Чвірко Агнешка Андрэеўна | XI | “Люблю цябе, мая старонка” зборнік вершаў да 75-годдзя з дня ўтварэння Ваўкавыскага раёна і 1010-годдзя Ваўкавыска | III |
| 10. | Гродзенскі | ДУА “Сярэдняя школа №3 Скідзеля” | Сыты Ілья Сяргеевіч | X | Я.Брыль “Memento mori” | III |
| 11. | Зэльвенскі | ДУА “Елкаўская сярэдняя школа” | Карней Антон Яўгенавіч | IX | С.Літвінчык “Колеры маёй зямлі” | III |
| 12. | Карэліцкі | ДУА “Сярэдняя школа г.п.Мір” | Сачук Ганна Аляксандраўна, Лазарава Вікторыя Дзмітрыеўна, Мурашко Паліна Дзмітрыеўна, Скок Валерыя Леанідаўна, Каласоўская Кацярына Валер’еўна, Бойка Ілона Дзмітрыеўна, Некраш Анастасія Аляксееўна, Медушэўскі Уладзіслаў Ігаравіч | IX | Павел Слабейка-песняр зямлі Карэліцкай | III |
| 13. | Кастрычніцкі | ДУА “Гімназія № 9 імя Ф.П. Кірычэнкі г.Гродна” | Радзівонаў Аляксей Дзмітрыевіч, Мармыш Ягор Мікалаевіч, Карвяк Леанід Паўлавіч, Кухта Мікіта Вітальевіч, Крышчык Арцём Андрэевіч, | XI | Васіль Быкаў “Жураўліны крык” | III |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Салей Вячаслаў Алегавіч, Кісялёў Іван Вечаслававіч | | | |
| 14. | Ленінскі | ДУА “Ліцэй №1 г.Гродна” | Казак Ганна Андрэеўна | X | “Гродна ў вершах і песнях: і памяць, і пашана, і любоў…” | III |
| 15. | Мастоўскі | ДУА “Мастоўскі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі” | Голец Дзмітрый Юр’евіч | IX | Зборнік вершаў Галіны Васілеўскай “Яблынька” | III |
| 16. | Свіслацкі | ДУА “Вучэбна-педагагічны комплекс Ханявіцкі дзіцячы сад – сярэдняя школа” | Шкодзіч Дар’я Іванаўна | X | Юрый Татарынаў “Княгіня Мянжынская” | III |
| 17. | Смаргонскі | ДУА “Сярэдняя школа № 6 г. Смаргоні” | Лісоўскі Арцем Іванавіч, Саўрыновіч Уладзіслаў Аляксандравіч | XI | Ф. Багушэвіч “Мая дудка” | III |

Дадатак 3

## “Мой родны кут, як ты мне мілы…”

### (III намінацыя – навучэнцы ўстаноў прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі)

| № | Установа адукацыі | Аўтар(ы) | Курс | Твор | Дыплом |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | УА “Навагрудскі дзяржаўны сельскагаспадарчы прафесійны ліцэй” | Жураўлёў Мікіта, Царук Андрэй, Крывошта Марк, Лагуцік Аляксандр, Раманейка Дзіяна | I-III | Л.Дайнека “Жалезныя жалуды” | I |
| 2. | УА “Мірскі дзяржаўны мастацкі прафесійна-тэхнічны каледж” | Іванова Марыя Вітальеўна, Свідзінская Наталля Вітальеўна | II | Раман Тармола-Мірскі “Восень” | II |
| 3. | УА “Гродзенскі дзяржаўны каледж тэхнікі, тэхналогій і дызайну” | Петралай Ягор Уладзіміравіч, Ключэўская Марыя Аляксандраўна | I<br>III | “Гродна турыстычны ў вершах і песнях” | II |
| 4. | Гуманітарны каледж установы адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы” | Кароль Любоў Сяргееўна, Новік Анастасія Сяргееўна | II | Аповесць В.Быкава “Знак бяды” | II |
| 5. | УА “Гродзенскі дзяржаўны прафесіянальна-тэхнічны каледж камунальнай гаспадаркі” | Чырко Юрый Дзмітрыевіч, Апалонік Кірыл Валянцінавіч | I | “Невадам з Нёмана” | II |
| 6. | УА “Гродзенскі дзяржаўны політэхнічны каледж” | Урублеўскі Дзмітрый Валер’евіч, Грыко Яўген Георгіевіч, Гнідко Кацярына Аляксандраўна, Добрук Людміла Францаўна | II | Данута Бічэль-Загнетава “Роднае слова” | III |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 7. | УА “Бераставіцкі дзяржаўны сельскагаспадарчы прафесійны ліцэй” | Цацерлеў Віталій Вадзімавіч | III | “Памяць” | III |
| 8. | УА “Слонімскі дзяржаўны медыцынскі каледж” | Блізнюк Павел Анатольевіч | II | Мой родны Слонім | III |
| 9. | УА “Слонімскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж сельскагаспадарчай вытворчасці” | Гайса Віктар Віктаравіч | II | Алег Лойка “Пралескі ў акопах” | III |
| 10. | Тэхналагічны каледж установы адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы” | Сільчанка Мацвей Аляксандравіч, Кучараў Яўгеній Аляксандравіч, Радзівон Мікіта Уладзіміравіч, Лішык Пётр Дзмітрыевіч | I | Я.Брыль “Memento mori” | III |